# РАЗНАСТАЙНАСЦЬ МОЎ І КУЛЬТУР У КАНТЭКСЦЕ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

# DIVERSITY OF LANGUAGES AND CULTURES IN THE CONTEXT OF GLOBALIZATION

2

Саюз беларускіх
пісьменнікаў

Міжнародная асацыяцыя беларусістаў

Таварыства беларускай мовы
імя Ф. Скарыны

Камітэт экалогіі чалавека
БелСаЭС «Чарнобыль»

Беларускае таварыства дружбы
і культурнай сувязі
з замежнымі краінамі

Нацыянальны навукова-асветніцкі
цэнтр імя Ф. Скарыны

Аляксандр Вабішчэвіч (Брэст, Беларусь)

# Беларуска-польскія міжкультурныя адносіны ў 1919–1939 гг.: супярэчнасці і спробы іх вырашэння

У гісторыі беларуска-польскіх міжкультурных узаемаадносін у XX ст. было шмат складаных, супярэчлівых і часам драматычных старонак. Сярод іх — нацыянальна-культурнае адраджэнне двух суседніх славянскіх народаў ва ўмовах станаўлення іх дзяржаўнасці ў міжваенны час (1919–1939).

Безумоўна, у час ваенных дзеянняў 1919–1920 гг. наіўным было б спадзяванне на нармальныя міжкультурныя кантакты. Хаця ў часткі беларускіх палітычных дзеячаў усё-такі былі надзеі на магчымасць аднаўлення незалежнасці бацькаўшчыны, асабліва пасля выдадзенай 22 красавіка 1919 г. у Вільні адозвы Ю. Пілсудскага «Да насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага». Прапольскія сімпатыі ўзмацняліся антыбеларускай палітыкай бальшавікоў. Паводле часовага распараджэння кіраўніка Цывільнай управы Усходніх зямель Е. Івашкевіча ад 11 кастрычніка 1919 г. дапускалася «свабода навучання на роднай мове…» [1]. Аднак на месцах, за некаторым выключэннем Міншчыны, польскія ўлады ігнаравалі нацыянальна-культурныя інтарэсы беларускага насельніцтва. Тыя невялікія ўступкі на карысць беларускай адукацыі, што былі дасягнуты ў сакавіку 1920 г. на перамовах паміж польскімі ўладамі і Найвышэйшай радай БНР, не далі кардынальных змен. Але пэўныя ілюзіі наконт раўнапраўнага партнёрства працягвалі захоўвацца. «Польская акупацыя пакінула па сабе справядлівую прыкрасць і расчараванне «шчырасцю» польскай палітыкі, якая разглядала Беларусь толькі як свае «ўсходнія крэсы», — адзначаў Б. Тарашкевіч. — Аднак свядомая беларуская нацыянальная думка не перастала шукаць падтрымкі ў Польшчы, верачы, што прынцыпы сапраўднага дэмакратызму мусяць урэшце перамагчы» [2]. Магчыма, што Б. Тарашкевіч сапраўды верыў у перамогу дэмакратыі ў адроджанай Польшчы [3].

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 883, воп. 1, спр. 45, арк. 74.

[2] Тарашкевіч Б. Беларускія палітычныя пастулаты // Скарыніч: Літ.-навук. гадавік / Укл. А. Каўка. Мн., 2002. Вып. 5. С. 107.

Аднак давялося не столькі чакаць, колькі выкарыстоўваць нярэдка выгадную палітычную кан'юктуру. З канца 1920 г. адносна спрыяльныя ўмовы для пашырэння беларускай культурна-асветніцкай дзейнасці склаліся на Віленшчыне, якая пасля захопу войскамі генерала Л. Жалігоўскага ўвайшла ў Сярэднюю Літву. Напярэдадні плануемага плебісцыту аб дзяржаўнай прыналежнасці згаданай тэрыторыі новым уладам патрэбна было заручыцца падтрымкай беларускай інтэлігенцыі. Б. Тарашкевіч узначаліў тады аддзел беларускіх школ пры Дэпартаменце асветы Сярэдняй Літвы. У студзені 1921 г. ужо дзейнічала 121 беларуская пачатковая школа [4]. У мястэчку Баруны была адкрыта беларуская настаўніцкая семінарыя. Менавіта на Віленшчыне ўзнікла ўплывовая пазней на заходнебеларускіх абшарах культурна-асветніцкая арганізацыя — Таварыства беларуская школы. Але з далучэннем Віленшчыны да Польшчы ўмовы для беларускага культурнага жыцця там значна пагоршыліся.

У пачатку 1920-х гг. пасля папярэдніх велізарных геапалітычных зрухаў ва Усходняй Еўропе ў склад ІІ Польскай Рэспублікі ўвайшлі не толькі этнічна польскія землі, але і шмат няпольскіх, а беларускія аказаліся падзеленымі дзяржаўнымі межамі. Гэта стварыла адрозныя зыходныя пазіцыі для функцыянавання польскай і беларускай культур. У той час калі беларуская культурная прастора была раз'яднанай (складалася з дзвюх асноўных частак — заходнебеларускай і савецкай беларускай), то ў польскай культуры вызначальнай стала кансалідуючая тэндэнцыя.

Хоць у межах Польскай дзяржавы беларусы з'яўляліся нацыянальнай меншасцю, аднак у яе паўночна-ўсходніх ваяводствах яны былі большасцю, а палякі, наадварот, — меншасцю. Якраз там і павінна было адбывацца актыўнае нацыянальна-культурнае ўзаемадзеянне і супрацьстаянне. «Крэсы ўсходнія» сталі сферай культурнай экспансіі Польшчы. Беларускае насельніцтва фармальна атрымала міжнародныя і канстытуцыйныя гарантыі асноўных правоў і свабоднага развіцця. Як гаварылася ў Рыжскім мірным дагаворы ад 18 сакавіка 1921 г., «асобы рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасці ў Польшчы маюць права ў межах унутранага заканадаўства карыстацца сваёй роднай мовай, арганізоўваць і падтрымліваць свае школы, развіваць сваю культуру і ствараць для гэтага таварыствы і саюзы» [5].

У рэальнасці ж сітуацыя была іншай. Замест культурнага ўзаемадзеяння ў норму ўвайшоў уціск і гвалт супраць беларускай культуры і мовы. Такое жорсткае сутыкненне было непазбежным. Яно не магло спрыяць дыялогу культур. Не толькі палітычныя, але і сацыяльна-эканамічныя,

---

[3] Бергман А. Слова пра Бранiслава Тарашкевiча: Гiст. жыццяпiс. Мн, 1996. С. 46.

[4] Дзяржаўны архiў Лiтвы. Ф. 172, воп. 1, спр. 233, арк. 30–37.

[5] Спадчына. 1993. № 4. С. 17.

канфесійныя, дэмаграфічныя, сацыяльна-псіхалагічныя і іншыя фактары прадвызначылі такі канфліктны характар польска-беларускіх міжкультурных адносін. Асабліва звяртаем увагу на сацыяльна-псіхалагічныя фактары. Беларусы не атрымалі цвёрдай упэўненасці, не адчулі сябе абароненымі на роднай зямлі, хоць і ў чужой (польскай) дзяржаве. Палякі, якія перажывалі агульнанацыянальны ўздым, эйфарыю, рост патрыятычных пачуццяў, аднačасова ўзмацнілі свой нацыянальны эгаізм, які знайшоў увасабленне ў палітыцы нацыянальнай ці дзяржаўнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва. А. Станкевіч потым даў гэтай з'яве трапную ацэнку — «неабмежаваны, немаральны нацыянальны ці дзяржаўны эгаізм»[6]. У польскай грамадскай свядомасці быў пашыраны стэрэатып, што Беларусь — гэта этнаграфічны teren przejściowy: беларусы-каталікі — палякі і г. д.

Варта адзначыць, што вельмі часта тады гаварылася аб узмацненні цывілізатарскага ўплыву на ўсходзе. Розны ўзровень сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця заходніх, цэнтральных ваяводстваў Польшчы і «крэсаў усходніх» сапраўды дыктаваў неабходнасць выканання тут цывілізатарскай, гуманітарнай місіі. Калі ў цэлым на тэрыторыі Польшчы ў 1920/21 навучальным годзе на 100 км$^2$ прыходзілася каля 7 школ, на 1 тыс. жыхароў — амаль 117 вучняў, то ў Навагрудскім ваяводстве — адпаведна 3 і 50, Палескім — менш 1 і 30[7].

Польскія ўрады ў першай палове 1920-х гг. праводзілі палітыку нацыянальнай асіміляцыі[8]. Найперш гэта выявілася ў паскоранай і гвалтоўнай паланізацыі, што ажыццяўлялася польскай школай, каталіцкай царквой, друкам, паліцэйска-адміністрацыйным апаратам, праз каланізацыю, агітацыйна-прапагандысцкую работу і г. д. Да 1922/23 навучальнага года ўцалелі толькі 32 беларускія пачатковыя школы, якія не маглі забяспечыць нават мінімальныя патрэбы нацыянальна-культурнага жыцця. Пагаршалася становішча і з друкам. Напрыклад, у 1924 г. з неперыядычных выданняў польскамоўныя складалі 80,7% (88,4% ад агульнага тыража), а беларускамоўныя — 0,5% (0,2% ад агульнага тыража). У 1925 г. выданняў на польскай мове было ўжо адпаведна 84,8% і 91,7%, на беларускай — 0,2% і 0,1%[9].

Прыняты польскім сеймам 31 ліпеня 1924 г. «Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў» не прывёў да ўрэгулявання міжкультурных канфліктаў. Была замацавана няроўнасць польскай і беларускай школ. У паветах, дзе пражывала не менш 25% беларускага насельніцтва, можна было адкрыць школу на роднай мове выкладання пры

---

[6] Калосьсе. 1937. № 3.

[7] Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej 1920/22. Warszawa, 1923. Cz. II. S. 279.

[8] Гл.: Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1979; Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984; Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. Gdańsk, 1992.

[9] Падлічана па выд.: Rocznik statystyki. 1925/1926. Warszawa, 1927. S. 365.

наяўнасці дэкларацый з подпісамі сарака бацькоў. Пры наяўнасці 20 подпісаў за навучанне па-польску павінна была адкрывацца польска-беларуская (утраквістычная) школа. А гэта быў крок у напрамку пераўтварэння іх у польскія. Аднак практычна нават такія абмежаваныя магчымасці не даваліся. Гэта яшчэ раз пацвердзіла, што адукацыя і культура наогул умацоўвалі свае пазіцыі на «крэсах усходніх» толькі шляхам дзяржаўнага пратэкцыянізму.

Майскі (1926) дзяржаўны пераварот у Польшчы не ўнёс карэнных зрухаў у характар польска-беларускіх міжкультурных адносін. Стратэгічным напрамкам у нацыянальнай палітыцы ўрадаў рэжыму «санацыі» стала дзяржаўная асіміляцыя меншасцяў. Змянілася толькі тактыка. Разам з праследаваннямі аўтарытарны рэжым Ю. Пілсудскага выкарыстоўваў абяцанні, нязначныя ўступкі. У 1927/28 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі акрамя чатырох прыватных беларускіх гімназій існавалі 23 дзяржаўныя беларускія пачатковыя школы і 49 польска-беларускіх. Аднак гэта было мізерам.

Заходнебеларускі нацыянальна-вызваленчы (у тым ліку і культурна-асветніцкі) рух быў натуральнай рэакцыяй, супрацьдзеяннем уціску. Таварыства беларускай школы, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры з'яўляліся ўплывовымі культурна-асветніцкімі арганізацыямі ў Заходнебеларускім краі. У сваю чаргу польскія (Польска мацеж школьна і інш.) мелі тут слабы ўплыў. Польскія ўлады мелі спрошчанае і стэрэатыпнае ўяўленне пра заходнебеларускі рух як пракамуністычны, несамастойны, інспіраваны з Усходу. Пэўныя падставы для гэтага былі [10]. Нягледзячы на савецкі ўплыў, заходнебеларуская культура ўсё ж захоўвала самастойнасць. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг. часткова аблягчала ёй самазахаванне ва ўмовах узмацнення паланізацыі.

На працягу міжваеннага перыяду рабіліся спробы не столькі ўрэгулявання, колькі змякчэння беларуска-польскіх культурных адносін. Асабліва яны актывізаваліся з абодвух бакоў у канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. Санацыйныя ўрады звязвалі карэктывы сваёй палітыкі са ступенню палітычнай лаяльнасці заходнебеларускага насельніцтва. «Мы не хочам іх (беларусаў. — *А. В.*) асіміляваць, — заявіў міністр веравызнанняў і грамадскай асветы Я. Янджэвіч, — мы толькі хочам, каб беларусы цягнуліся да нас, а не да Масквы» [11]. Аб умовах дыялога ў тагачасных абставінах гаварыў у польскім сейме беларускі дэпутат Альбін Стаповіч 7 лютага 1929 г.: «Пакуль сетка польскіх школ, якая пакрывае беларускую зямлю, не будзе заменена на беларускую, пакуль польскае святарства будзе праводзіць шкодную падбухторніцкую супраць беларусаў палітыку, пакуль школа і

---

[10] Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн., 2000. С. 180–195.

[11] НАРБ. Ф. 242, воп. 1, спр. 435, арк. 45.

касцёл будуць і надалей зброяй паланізацыі, датуль не можа быць мовы пра згоднае існаванне двух народаў, датуль не можа быць мовы пра нейкае беларуска-польскае збліжэнне…» [12]

Частка заходнебеларускіх дзеячаў усё-такі пайшла на пошукі паразумення з польскімі ўладамі, зыходзячы з прагматычных меркаванняў. Беларускі сялянскі саюз падтрымліваў ідэю культурнай аўтаноміі беларусаў у Польшчы. Створанае ў пачатку 1930-х гг. А. Луцкевічам, Р. Астроўскім Таварыства беларускай асветы заяўляла аб адыходзе ад палітычнай дзейнасці: «Праца над развіццём беларускай культуры, пашырэннем школьнай і пазашкольнай асветы беларусаў на іх роднай мове, уздымам маральнага ўзроўню і вывучэннем польскай культуры, культурных адметнасцяў іншых народаў, якія жывуць на супольнай тэрыторыі з беларусамі» [13] . Аднак паланафільскія таварыствы і групоўкі былі нешматлікімі, не мелі шырокай сацыяльнай базы. Акрамя таго, пасля рэпрэсіўных дзеянняў з сярэдзіны 1930-х гг. амаль спынілася дзейнасць ТБШ і БІГіК, засталася толькі адна беларуская гімназія ў Вільні і некалькі пачатковых школ. Як і ў 1920-я гг., рэзка абвастрылася праблема самазахавання заходнебеларускай культуры.

Нягледзячы на гэта, пераважна патрыярхальна-натуральны ўклад жыцця і побыту, слабасць працэсаў урбанізацыі, адсутнасць індустрыялізацыі, наступствы сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг. і іншыя прычыны ўратавалі ад разбурэння заходнебеларускую традыцыйную культуру. Элітная культурная спадчына, што тварылася нешматлікай заходнебеларускай інтэлігенцыяй, пакінула шмат імёнаў і каштоўнасцяў еўрапейскага і нават сусветнага ўзроўню. Сярод іх — Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, А. Станкевіч, У. Самойла, Я. Драздовіч. М. Танк, Н. Арсеннева і інш. Насуперак мэтаў дзяржаўнага апарату польская дэмакратычная інтэлігенцыя выступала за наладжванне гарманічных беларуска-польскіх кантактаў. З іх найперш трэба адзначыць віленскі асяродак (Т. Урублеўскі, Л. Абрамовіч і інш.). Значныя крокі ў напрамку дыялога спрабавала рабіць рэдакцыя тыднёвіка «Przegląd Wileński» (Вільня).

Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што патрэбы часу ўсё ж прымушалі польскія ўлады адкрываць новыя ўстановы адукацыі, культуры, весці змаганне з непісьменнасцю, г. зн. выконваць сваю цывілізатарскую місію. Аднак пры гэтым ігнараваліся патрэбы беларускай культуры, мовы. Сацыяльна-эканамічныя інтарэсы былі задаволены толькі часткова.

Да канца 1930-х гг. ужо не засталося арганізаваных форм барацьбы супраць паланізацыі (ТБШ, БІГіК былі забаронены ў канцы 1936 г.). У сувязі са зменамі ў нацыянальна-дзяржаўнай палітыцы БССР з яе боку спынілася

---

[12] Спадчына. 1994. № 6. С. 23.

[13] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 3, воп. 1, спр. 31, арк. 3.

рэальная падтрымка заходнебеларускай грамадскасці. Тым не менш, беларуская культура не прайграла ў сутыкненні з польскай. Справа ў тым, што парытэтнага, паўнавартаснага суперніцтва не было. Культурная інтэграцыя не адбывалася. Польская культурная экспансія на «ўсходнія крэсы» таксама не здзейснілася. Магчыма, што праз польскую мову, адукацыю заходнія беларусы былі б далучаны да каштоўнасцяў еўрапейскай цывілізацыі. Аднак уздым не толькі польскага патрыятызму, але і шавінізму паўплываў на адкрыццё заходнебеларускім насельніцтвам сваёй нацыянальна-культурнай тоеснасці. Сама рэчаіснасць аказала мабілізуючае ўздзеянне на працэс самазахавання. Здзейснілася толькі адміністрацыйная, фармальная паланізацыя. Безумоўна, што запланаваныя польскай адміністрацыяй у 1936–1939 гг. сур'ёзныя меры, у тым ліку намеры масавай каланізацыі [14], маглі істотна паскорыць дэнацыяналізацыю заходніх беларусаў.

[14] Юзаф Пілсудскі ў гісторыі Польшчы і Беларусі: Матэрыялы міжнар. навук. семінара. Мінск, 5–6 красавіка 2002 г. Мн., 2002. С. 33–36.

**Alyaksandr Vabishchevich (Brest, Belarus)**

## The Belarusian–Polish intercultural relations in 1919–1939: Contradictions and attempts to solve them

The period of 1920s–1930s in the Belarusian–Polish cultural interrelations was the most difficult, conflicting and sometimes dramatic one, that being related to the both nations statehood formation and national egoism manifestation. In 1920–1921 the West Belarusian population managed to gain some concessions for the sake of their culture (chiefly in the education sphere), particularly related to the so called Middle Lithuania formation with 121 Belarusian schools functioning there. Yet the «Law on the language and schooling for the national minorities organization» adopted by the Polish Seim strengthened the Polish and Belarusian inequality. In the Eastern «kresy» the Polonization and national assimilation processes became still deeper. The number of Belarusian schools has been greatly reduced.

At the end of the 1920s – beginning of the 1930s there has been observed some softening of the international and intercultural conflicts. The Beslarusian political loyalty to the Polish state became a criterion of the attitude to them. On the pragmatic considerations basis a number of West Belarusian organizations and activists started looking for a consent with the Polish authorities. Yet the Stalinist repression in the BSSR stopped this process. By the end of the 1930s there were left no organized forms of the opposition to Polonization.